Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

Ядвіга Казлоўская-Дода
Люблін

Біблійная фразеалогія беларускай і польскай моў: агульнае і рознае

Biblical phraseology in Belarusian and Polish: similarities and differences

1. Рэлігійныя тэксты ў функцыянальна-стылявым падзеле беларускай літаратурнай мовы

Ва ўступе хацелася б звярнуць ўвагу на месца сакральных тэкстаў ў функцыянальна-стылявой дыферэнцыяцыі беларускай літаратурнай мовы. У працах па стылістыцы беларускай мовы сучасныя тэксты рэлігійнага характару звычайна не ўлічваюцца пры класіфікацыях. Адным з выключэнняў з'яўляецца згадка, дарэчы вельмі агульная, В. П. Краснея ў беларускай манаграфіі, выніку міжнароднага праекта „Змены ў сучасных славянскіх мовах. 1945–1995 гг." – *Беларуская мова* з серыі выданняў *Найноўшая гісторыя славянскіх моў* (*Najnowsze dzieje języków słowiańskich*), выдадзенай у Аполі ў 1998 г.:

> Адраджэнне духоўнай культуры ў наш час немагчыма без адраджэння культурнай ролі традыцыйных для Беларусі хрысціянскіх канфесій. Праўда, пакуль што і праваслаўная царква, і каталіцкі касцёл, і пратэстанцыя канфесіі ў багаслужбе не карыстаюцца шырока беларускай мовай. Але ўжо з'явіліся пераклады Святога Пісьма, што сведчыць аб рапрацоўцы пэўных спосабаў і прыёмаў моўнага выражэння ў новай функцыянальнай сферы – сферы рэлігійнага жыцця. Наколькі плённым акажацца фарміраванне канфесіянальнага стылю беларускай літаратурнай мовы, будзе залежыць ад сацыяльных фактараў, ад нацыянальна-культурнай і ад нацыянальна-моўнай палітыкі дзяржавы.[1]

Такі падыход у беларускім мовазнаўстве, прынамсі, не з'яўляецца выключэннем у мовазнаўстве ўвогуле. Так, Д. Здункевіч-Едынак у *Лекцыях па стылістыцы* (*Wykłady ze stylistyki*) падкрэслівае:

[1] М. П. Красней, *Функцыянальна-стылявая дыферэнцыяцыя беларускай літаратурнай мовы*, [у:] *Беларуская мова. Najnowsze dzieje języków słowiańkich*, рэд. А. Лукашанец, М. Прыгодзіч, Л. Сямешка, Opole 1998, с. 260.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

> Żadna z klasycznych już dziś typologii stylistycznych odmian polszczyzny […][2] nie uwzględnia jako odrębnej odmiany funkcjonalnej języka religijnego, choć takie traktowanie języka religijnego postulują od dawna m.in. M. Wojtak, J. Puzynina, I. Bajerowa. Dopiero w 2002 r. uwzględnił ją A. Wilkoń,[3] przydając jej status odmiany funkcjonalnej, wyróżnionej na tym samym piętrze stratyfikacyjnym, co takie odmiany użytkowe, jak język urzędowy, naukowy czy potoczny.[4]

Патрэбна памятаць, што сакральная сфера жыцця палякаў лічацца вельмі важнай, а з ёй звязаныя тэксты, як і даследаванне рэлігійнай польскай мовы маюць доўгую традыцыю. Аўтарцы *Лекцый* бліжэйшы ўсё ж такі падзел А. Маркоўскага на рэлігійную і свецкую мову, і толькі ў далейшай чарзе ў свецкім маўленні даследчыца схільная выдзяляць мастацкі і размоўны спосаб апісання свету.[5]

Пэўныя змены апошнім часам адбыліся і ў беларускім мовазнаўстве, напр. нядаўна выдадзены вучэбны дапаможнік для студэнтаў-філолагаў *Стылістыка і культура беларускага маўлення* А. М. Багамолавай і Г. К. Семяньковай разглядае таксама шосты функцыянальны стыль – канфесійны, побач з чатырма кніжнымі (афіцыйна-справавым, навуковым, публіцыстычным і мастацкім) і гутарковым або размоўным.[6] Аўтаркі тлумачаць наяўнасць канфесійнага стылю ў працах „некаторых" даследчыкаў „павелічэннем колькасці рэлігійнай літаратуры на беларускай мове" і „тым, што набажэнства ў многіх храмах вядзецца па беларуску".[7]

Сакральная (інакш канфесійная, царкоўна-рэлігійная) мова характарызуецца ўнутранай дыферэнцыяцыяй. Цэнтральнае месца ў ёй мовазнаўцы прызнаюць біблійнаму стылю.[8] Ён, найбольш стабільны, лічыцца дэрывацыйнай асновай для іншых жанраў рэлігійных тэкстаў. Для Святога Пісання характэрныя свае спецыфічныя лексіка і сінтаксіс.

Поўную класіфікацыю рэлігійных жанраў ажыццявіў польскі мовазнаўца А. Вількань, які вылучыў, у першую чаргу, біблійныя жанры, а таксама жанры, звязаныя з дзейнасцю Касцёла і ягоных інстытуцый. У першай групе даследчык, спасылаючыся на артыкул Т. Ялёнка[9], выдзяліў гістарычныя (напр. евангеллі, апакаліпсіс) і павучальныя жанры (напр. прытча, пропаведзь); у другой групе адпаведна: творы, звязаныя з Новым Запаветам, напр. песні (якія ўслаўляюць Марыю, Нараджэнне Хрыстова, апісваюць смерць Езуса), містэрыі і рэлі-

---

2 Аўтарка абапіраецца на класіфікацыях З. Клеменсевіча, С. Урбаньчыка, А. Фурдаля, Т. Скубалянкі, Д. Бутлер, С. Гайды, зробленых у 1961–2001 гг. Параўн.: D. Zdunkiewicz-Jedynek, *Wykłady ze stylistyki*, Warszawa 2010, c. 30–34.

3 A. Wilkoń, *Spójność i struktura tekstu*, Kraków 2002, c. 266–274.

4 D. Zdunkiewicz-Jedynek, *Wykłady ze stylistyki*, Warszawa 2010, c. 108.

5 D. Zdunkiewicz-Jedynek, *Wykłady*…, c. 108, чытата па: A. Markowski, *Kultura języka polskiego. Teoria. Zagadnienia leksykalne*, Warszawa 2005.

6 А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова, *Стылістыка і культура беларускага маўлення,* Мінск 2012.

7 А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова, *Стылістыка…,* с. 8.

8 D. Zdunkiewicz-Jedynek, *Wykłady*…, c. 108, Wilkoń A., *Spójność*…, c. 266–273.

9 T. Jelonek, *Próba klasyfikacji biblijnych gatunków literackich*, „Polonia Sacra" (XX), № 2/46, c. 95–114.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

гійныя драмы; апокрыфы і жыцці святых, творы-малітвы, напр. гадзіны; творы вуснай народнай творчасці, напр. калядкі; жанры, звязаныя з пастырскай дзейнасцю Касцёла, напр. булы, энцыклікі; прагматычныя жанры, напр. споведзь; метафізічная і містычная лірыка (напр. рэлігійна-метафізічныя паэмы).[10]

Падобным чынам, толькі менш падрабязна і дэталёва, спасылаючыся на расійскі слоўнік па *Стылістыцы і стылях* Н. Н. Раманавай і А. В. Філіпава[11], А. Багамолава і Г. Семянькова назвалі наступныя падстылі канфесійнага (ці царкоўна-рэлігійнага) стылю: падстыль перакладаў кніг Бібліі; прапаведніцкі падстыль (напр. пропаведзь); агіяграфічны (напр. жыцці святых); падстыль царкоўных пасланняў.[12]

2. Устойлівыя словазлучэнні з Бібліі як прыкмета канфесійнага стылю

Пытанні беларускай біблійнай фразеалогіі дасюль былі адсунуты на перыферыю фразеалагічных даследаванняў. Да канца XX стагоддзя яны абмяжоўваліся асобнымі кароткімі заўвагамі. Напр., аўтар фразеалагічнага слоўніка беларускай мовы ў двух тамах І. Лепешаў падкрэслівае, што кнігі Бібліі з'яўляюцца вытокам амаль усіх фразеалагічных царкоўнаславянізмаў, якія належаць да найбольш ранніх запазычанняў:[13]

> У сучаснай беларускай мове ёсць запазычанні, калькі і паўкалькі з царкоўнаславянскай мовы – з кніг „Свяшчэннага пісання" (Бібліі, Евангелля, Псалтыра і інш.).[14] Запазычанні: *абтрэсці прах з ног* (чыіх, каго), *аддзяляць авец ад козлішч, альфа і амега, з мірам, імя каму легіён, кесарава кесараві, косць ад косці* (каго, чыёй), *на руках насіць* (каго), *перакаваць мячы на аралы, песня песняў, плоць ад плоці* (каго чыёй), *святая святых, соль зямлі, умыць рукі, вечная памяць* (каму), *на кругі свая*. Калькі: *галаву прыхінуць, блуканне па пакутах*. Паўкалькі: *перці супраць ражна, у поце твару, хлеб надзённы, язык прыліп да горла* (у каго,чый), *кінуць камень* (у каго).[15]

У пазнейшай сваёй публікацыі даследчык удакладняе (ніжэй прыведзенай цытаце папярэднічае працяглы ўступ пра значэнне *Бібліі* для развіцця сусветнай культуры, што можна лічыць абгрунтаваным, вучэбны дапаможнік рэкамендаваны для студэнтаў, а рэлігіязнаўчая адукацыя на Беларусі дасюль не на вышэйшым узроўні)[16]:

---

10 D. Zdunkiewicz-Jedynek, *Wykłady*…, c. 116–117; Wilkoń A., *Spójność…*, c. 266–273.

11 Н. Н. Романова, А. В. Филиппов, *Стилистика и стили*. Учебное пособие: словарь, Москва 2006.

12 А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова, *Стылістыка…*, с. 55.

13 І. Лепешаў, *Фразеалогія сучаснай беларускай мовы*, Мінск 1998, с. 35–36.

14 Чамусьці Біблія згадваецца асобна, а яе часткі асобна?..

15 І. Лепешаў, *Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні*, Гродна 2002, с. 91.

16 І сёння шмат падручнікаў, у якіх аўтары не лічаць мэтазгодным назваць *Біблію* як крыніцу фразеалогіі, напр.: 3-е выпраўленае выданне *Сучаснай беларускай мовы*, рэд. Л.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

> […] У сучаснай беларускай літаратурнай мове ёсць, па нашых падліках, 115 фразеалагізмаў і 19 прыказак, якія сваім жыццём абавязаны Бібліі. Вось некаторыя з іх: *ад Адама, адамаў яблык, блудны сын, казёл адпушчэння, кінуць камень, косць ад косці, краевугольны камень, перакаваць мячы на аралы, соль зямлі, умыць рукі; Няма прарока ў сваёй айчыне; Не хлебам адзіным жыве чалавек; Хто сее вецер, той пажне буру; Хто не працуе, той не есць; Што пасееш, тое і пажнеш; Не капай другому яму, сам у яе ўвалішся*.[17]

У замежным мовазнаўстве сфармаваўся нават тэрмін на „jednostkę języka o dającym się ustalić pochodzeniu od tekstów biblijnych, niezależnie od swej postaci formalnej (wyraz – grupa wyrazowa – zdanie) i statusu semantycznego kodowaną w pamięci językowej danego narodu i odtwarzaną w produkcji tekstów danego języka" (дэфініцыя, якую запрапанаваў В. Хлебда)[18] – *біблеізм*, польск. *biblizm*, укр. *біблеїзм*, рус. *библеизм*. Ім карыстаецца дарэчы (менавіта як тэрмінам) таксама і І. Лепешаў.[19] Гіперонім *біблеізм* выкарыстоўваюць як для асобных лексічных адзінак (уласных назваў, агульнай лексікі, паняццяў), устойлівых словазлучэнняў (фразеалагізмаў, ідыёмаў і г.д.), так і для канструкцый са структурай сказа (сентэнцый, прыказак, афарызмаў, крылатых слоў).[20]

Перадусім шматлікія працы С. Казяры[21] (але не выключна, бо таксама Д. Бенькоўскай, *Польскі біблійны стыль*[22], Б. Вальчака[23] і інш.)[24] былі штуршком, каб

М. Грыгор'ева, Мінск 2010, с. 203–204, абмяжоўваецца інфармацыяй аб запазачаннях фразеалагізмаў з царкоўнаславянскай мовы, затое ў якасці крыніцы фразеалагічных адзінак называюцца міфы старажытнай Грэцыі, і тут пра мову-пасярэдніцу ўжо гаворкі няма. Не могуць здзіўляць і выданні мастацкіх твораў замежных аўтараў, напр. паэт А. Хадановіч, які аднавіў папярэдні пераклад Я. Бяганскай *Караля Мацюся Першага* Я. Корчака, „Юнацтва", Мінск 1998, у сваім блогу напісаў: „Цікавыя рэчы выявіліся падчас падрыхтоўкі да друку новага выдання аповесці Януша Корчака *Кароль Мацюсь Першы*. Выданне – і гэта ў канцы 90-х! – было досыць жорстка адцэнзураванае. Напрыклад, з тэксту былі выкінутыя ўсе згадкі пра Бога, рэлігію, малітвы і г.д." (http://khadanovich.livejournal.com/262802.html, доступ: 23.02.2013).

17 І. Лепешаў, *Лінгвістычны аналіз тэксту*, Мінск 2009, с. 9, спасылка 1.

18 W. Chlebda, *Biblizmy języka rosyjskiego. Koncepcje opisu leksykograficznego*, [w:] *Biblia w literaturze i folklorze narodów słowiańskich*, red. R. Łużny, D. Piwowarska, Kraków 1998, c. 17.

19 Фразеолаг папракае аўтараў новага слоўніка сучаснай беларускай мовы за адсутнасць слова *біблеізм*: І. Лепешаў, *Слоўнік добры, але не надта…* (рэц. на *Слоўнік беларускай мовы*. Мінск 2012.), „Наша Слова", № 23 (1070), 06.06.2012 (http://slounik.org/sbm/#, доступ 17.09.2012).

20 S. Koziara, *Tradycyjne biblizmy a nowe polskie przekłady Pisma Świętego*, Kraków 2009, c. 21.

21 Таксама: S. Koziara, *Frazeologia biblijna w języku polskim*, Kraków 2001.

22 D. Bieńkowska, *Polski biblijny styl*, Łódź 2002.

23 Між іншым: B. Walczak, *Biblia a język. O warstwie biblijnej w polskiej frazeologii*, „Życie i Myśl" 1985, № 11–12, c. 28–39; B. Walczak, *Jeszcze raz w sprawie języka współczesnych tłumaczeń Biblii (w związku z nowym przekładem Ewangelii św. Marka pióra ks. Tomasza Więcławskiego)*, Poznańskie Spotkania Językoznawcze, red. Z. Krążyńska, Z. Zagórski, t. 9, 2002, c. 153–160.

24 Асабліва слоўнікі біблеізмаў: J. Godyń, *Od Adama i Ewy zaczynać. Mały słownik biblizmów języka polskiego*, Kraków–Warszawa 1995; A. M. Komornicka, *Słownik zwrotów i aluzji biblijnych*, Łódź 1994.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

звярнуць увагу на беларускую фразеалогію, якая мае крыніцу ў Бібліі. Як дасюль няшмат мы пра яе ведаем.

Да праблемы перакладаў Святога Пісання на беларускую мову звярталіся нешматлікія даследчыкі беларушчыны (у параўнанні з бібліяграфіяй прац польскіх даследчыкаў)[25], сярод іх І. А. Чарота[26], М. Сяднёў[27], М. Цімошук[28], І. І. Трацяк[29], В. У. Фурс.[30]

На сённяшні дзень існуе 15 перакладаў на сучасную беларускую мову Новага Запавета і тры – Старога.[31] Нягледзячы на колькасць перакладаў, агульнапрымальнага беларускамоўнага тэксту Бібліі няма.[32] Пра патрэбу стварэння „новага, якаснага, навуковага перакладу Бібліі з арыгінальных моў – Беларускай Бібліі, якая была б надканфэсійная, канфэсійна прымальная, якая б мела ўсе тыя нацыятворчыя і культуратворчыя функцыі”[33] і тое, якім чынам можна гэта зрабіць разважалі навукоўцы пад кіраўніцтвам філолага і тэолага І. Дубянецкай на секцыі *Беларуская Біблія: праблемы і перспектывы навуковага перакладу* на Другім і Трэцім міжнародным кангрэсе даследчыкаў Беларусі ў Каўнасе ў верасні 2012 года і кастрычніку 2013 года.

---

25 S. Koziara, *Tradycyjne biblizmy…*, бібліографія на с. 356–367.

26 Напр.: І. А. Чарота, *Мова нацыянальная = мова сакральная?* „Ступени”, № 6 (1), http://minds.by/stupeny/nomera/6/st6_13.html, доступ 23.02.2013; [перадрукавана:] І. А. Чарота, *Пераклады свяшчэннага пісання як фактар сцвярджэння беларускай мовы*, [у:] І. А. Чарота, *Тэорыя і практыка мастацкага перакладу*, Мінск 2010, с. 44–50 (http://www.bsu.by/Cache/pdf/232763.pdf, доступ 23.02.2013).

27 М. Сяднёў, *Да пытання перакладаў рэлігійных тэкстаў на беларускую мову*, „Беларусіка – Albaruthenica” 1, Мінск 1995, с. 71–74.

28 M. Timoszuk, *O trzech współczesnych przekładach Nowego Testamentu na język białoruski*, „Acta Albaruthenica” 6, Warszawa 2007, с. 33–42; M. Timoszuk, *Współczesne białoruskie słownictwo sakralne w przekładach Pisma Świętego*, „Studia Białorutenistyczne” 4, Lublin 2010, с. 275–282.

29 І. І. Трацяк, *Шлях да беларускамоўнай бібліі*, [у:] І. І. Трацяк, *Біблія ў кантэксце беларускай культуры*, Гродна 2003 (http://www.lib.grsu.by/library/data/resources/catalog/66752.pdf, доступ 23.02.2013); І. І. Трацяк, *Біблія ў беларускім перакладзе: праблема высокага стылю*, [у:] *Надзённыя пытанні лінгвістыкі (да 75 годдзя прафесара П. У. Сцяцко)*, Гродна 2005, с. 94–98 (http://carkva-gazeta.by/index.php?nr=54&id=25, доступ 23.02.2013);

30 В. У. Фурс, *Сучасныя беларускія пераклады Евангелля паводле Мацвея: характар і фактары варыянтнасці выкладаў аднаго зместу ў тэкстах розных тыпаў:* аўтарэф. дыс. … канд. філалагічных навук; нав. кір. Н. Б. Мячкоўская; НАН Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы, Мінск 2009, 22 с. (с. 18–19 бібліяграфія яе ж артыкулаў і матэрыялаў канферэнцый, разам 13 публікацый).

31 І. А. Чарота, *Тэорыя і практыка мастацкага перакладу..*, с. 44; выкананы і пераклад на адну з палескіх гаворак з мэтай яе захавання Ф. Д. Клімчуком: *Новый Завет Господа нашего Іісуса Хріста. Перевод на западнополесскій говор*, Мінск 2010, 392 с.

32 І. А. Чарота, *Тэорыя і практыка..*, с. 49.

33 І. Дубянецкая, *Беларусь у XXI стагоддзі мусіць мець сваю Біблію*, http://www. svaboda.org/content/article/24723996.html, доступ 24.02.2013.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

3. Тыпы міжкультурных эквівалентаў біблійнай фразеалогіі

У артыкуле не будуць аналізавацца ўсе варыянты, якія выступаюць у розных перакладах Святога Пісання на беларускую мову. Матэрыял складаюць моўныя адзінкі толькі з Новага Запавета і толькі аднаго пераклада – кс. У. Чарняўскага пад рэдакцыяй Ж. Некрашэвіч-Кароткай, выдадзенага Біблейскім таварыствам РБ у 2003 г., таму што менавіта гэты пераклад меў „задаволіць патрэбы ўсяго беларускага народа, не дзелячы яго на групы па канфесійнаму прызнаку ці па тэрыторыі пражывання".[34] Мяне будуць цікавіць беларускія адпаведнікі прыкладаў, разгледжаных С. Казярам ў польскіх перакладах, на колькі яны адлюстраваны ў фразеалагічных слоўніках беларускай мовы[35] і, часам, калі эквівалент адсутнічае ў слоўніках, ці (або як) ён фунцыянуе ў т.зв. „жывой" камунікацыі, напр. польскі даследчык правяраў інтэрнэт-старонкі, я да іх таксама буду звяртацца.

У артыкуле аналізуюцца выключна беларускія адпаведнікі[36] польскіх традыцыйных назоўнікавых (33) і дзеяслоўных фразеалагізмаў (20) з Новага запавета (разам 53 моўныя адзінкі), разгледжаных ў манаграфіі С. Казяры (с. 76–153). Такі падыход тлумачыцца абмежаванасцю памеру тэксту, а таксама спробай праверыць слушнасць аналізу.

Не разглядаюцца назоўнікавыя і дзеяслоўныя фразеалагізмы са Старога Запавета (с. 76–153), фразеалагізмы са структурай сказа (с. 154–187), біблійныя формулы (с. 211–241), прыказкі, сентэнцыі і афарызмы з Новага Запавета (с. 242–301), а таксама замацаваныя перыкопы з Новага Запавета – фрагменты Бібліі, якія чытаюць і тлумачаць падчас службы (с. 302–342). Таму ў матэрыяле не выступаюць такія прыклады, як *вока за вока, зуб за зуб*; *Бог мне сведка*, *альфа і амега* і шматлікія іншыя.

Па беларускіх цытатах прыведзены фразеалагічныя адзінкі ў польскай версіі, найбольш распаўсюджанай у перакладах, пададзены дакладныя месцы ў біблійным тэксце, дэфініцыя ў фразеалагічных слоўніках і цытаты з тэкстаў мастацкай літаратуры, публіцыстыкі, з інтэрнэт-старонак (звычайна, калі ў фразеалагічных слоўніках адсутнічаюць, а даволі шырока ўжываюцца).

Дадзены артыкул не прадугледжвае глыбокага кантрастыўнага аналізу фразеалагічных адзінак у абедзвюх мовах, хоць, безумоўна, параўнанне агульных і адрозных рыс на ўзроўні формы і зместу, а таксама супастаўленне анамасіялагічных перадумоў тых ці іншых фразеалагічных адзінак было б цалкам мэтазгодныи.

---

[34] Прадмова да: *Новы Запавет*, Мінск 2003, с. 4.

[35] Галоўным чынам у: І. І. Лепешаў, *Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы,* у 2 т., Мінск 1993; А. Аксамітаў, М. Чурак, *Польска-беларускі фразеалагічны слоўнік*, Варшава 2000; асобныя прыклады ўзяты з: М. А. Даніловіч, *Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны*, Гродна 2000.

[36] Толькі з аднаго перакладу, менавіта кс. У. Чарняўскага, рэд. Ж. Некрашэвіч-Кароткая.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

Назоўнікавыя фразеалагізмы

Сярод іх слоўнікі не фіксуюць наступных:

1. *арка запавету* (*arka przymierza*), НЗ Геб. 9,4; Адк. 11,19;

2. *брамы пякельныя* (*bramy piekielne*), НЗ Мц 16,18;

3. *вясельныя шаты* (*szata godowa*), НЗ Мц. 22,11; 22,12;

4. *вясселле* × 8; *час шлюбу* × 1; *вячэра шлюбная* × 1 *(uczta weselna*), НЗ Мц. 22,2; 22,3; 22,4; 22,8; 22,9; 22,25; 22,10; Лк. 12,36; 14,8; Ян. 2,1; 2,2; Адк. 19,7; 19,9;

5. *гарчычнае зерне* × 3; *зярнятка гарчычнае* × 2 (*ziarno / ziarnko gorczycy*), НЗ Лк. 13,19; Мк. 4,31; Мц. 13,31; 17,20; Лк. 17,6;

6. *голас лямантуючага (клічучага) ў пустыні* (*głos wołającego na puszczy / pustyni*), НЗ Мц.3,3; Лк. 3,4; Ян. 1,23; Мк. 1,3;

7. *дзеці Божыя* × 6; *Сыны Божыя* × 4 (*dziecko / dzieci Boże*), НЗ Ян. 1,12; 11,52; Рым. 8,16; 8,21; 9,8; Плп. 2,15; 1 Ян. 3,1; 3,2; 3,10; 5,2;

8. *духоўная страва* (*pokarm duchowy*), НЗ 1 Кар. 10,3;

9. *знак* × 1; *час (гэтага часу не ўмееце распазнаць)*× 1 (*znak / znaki czasu*), НЗ Мц. 16,4; Лк. 12,56;

10. *зорка ранняя; ранняя зорка; яснеючая ранішняя зорка* (*gwiazda zaranna / poranna*), НЗ 2 Пёт. 1, 19; Адк 2, 28; Адк. 22, 16;

11. *каменныя табліцы* (*kamienne tablice*), НЗ 2 Кар. 3,3;

12. *камень спатыкнення; камень спатыкнення і камень згаршэння* (*kamień obrazy*), НЗ Рым. 9,32; 9,33; 1 Пёт 2,8;

13. *кніжнікі* × 10; *першасвятары і кніжнікі* × 1; *кніжнікі фарызейскія* × 1 (*uczony w piśmie*), НЗ Мц. 5,20; 7, 29; 8,19; 9,3; 12, 38; 13,52; 15,1; 17,10; 20,18; 23,2; 23,13; 23, 15; 16, 21; Мк. 6,10 і г.д.;

14. *магілы пабеленыя* (*groby pobielane*), НЗ Мц. 23, 27;

15. *меч двусечны; меч двусечны востры* (*miecz obosieczny*), НЗ Геб. 4,12; Адк. 1,16; 2,12;

16. *пячора разбойнікаў* (*jaskinia zbójców*), НЗ Мц. 21,13; Мк 11,17; Лк. 19,46;

17. *свет, які Бог стварыў* × 1; *стварэнне Бога* × 1; *тварэнне Божае* × 1 (*stworzenie Boże / Boskie*), НЗ Мк 13,19; 1 Цім. 4,4; Адк. 3,4;

18. *сілы нябесныя* ×1; *сілы, што на небе* × 2 (*moce niebiańskie*),
НЗ Мц. 24,29; Мк. 13,25; Лк. 21,26;

19. *убогія духам* (*ubogi duchem / w duchu*), НЗ Мц. 5,3;

20. *фальшывыя прарокі* (*fałszywy prorok*), НЗ Мц. 7,15; 24,11; 24,24; Мк. 13,22; Лк. 6, 26; Дзеі 13,6; 2 Пёт. 2,1; 1 Ян. 4,1; Адк. 16,13; 19,20; 20,10.

Ніжэй пералічаныя фразеалагічныя адзінкі выступілі ў слоўніках:

1. *верны і разумны слуга* ×1; *слуга добры і верны* × 1; *верны слуга* × 2; *верны для вас слуга* × 1 (*sługa wierny*), НЗ Мц. 24,45; 25,21; 25,23; Эф.6,21; Кал. 4,7; Кал. 1,7; у абодвух слоўніках зафіксавана толькі *ваш пакорны слуга* (устар., кніжн.) – *sługa uniżony* (Акс., Чур., 172; Леп., 2, 367), што не адпавядае біблійнаму эквіваленту. Аднак параўн.: *Культуры верны слуга. Так без перабольшвання можна сказаць*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

пра Эдуарда Лапыша,[37] *Чаму ж не змыеш ты цярпенняў раны / З душы і сэрца верных слуг тваіх*?[38]

2. *вянок (вянец; карона) з церняў* (*korona cierniowa*), НЗ Мц. 27,29; Мк. 15,17; Ян. 19,2; у двухтомным слоўніку адсутнічае, у польска-беларускім слоўніку фразеалагізмаў знойдзем *цярновы вянок – korona cierniowa, wieniec cierniowy* (Акс., Чур., 56);

3. *галава вугла* × 5; *вуглавы камень* × 1 (*kamień węgielny*), НЗ Мц. 21,42; Мк. 12, 10; Лк. 20,17; Дзеі 4,11; 1 Пёт 2, 7; Эф. 2,20; іншую версію фразеалагізма *краевугольны камень* (кніжн.) ‘аснова, сутнасць, найважнейшая частка чаго-н.’ знаходзім у Лепешава (Леп. 1,482), а таксама Аксамітава і Чурак (Акс., Чур., 103). Форма, ужытая ў перакладзе менш распаўсюджаная ў жывой камунікацыі, сустракаецца толькі зрэдку, напр. *Я думаю б не ставіў ў галаву вугла сілікатныя блокі*[39];

4. *дар Божы* (*dar Boży*), НЗ Ян. 4,10; Дзеі 8,20; фіксуе беларуска-польскі фразеалагічны слоўнік (Акс., Чур, 77), у Лепешава знойдзем толькі ў межах іншага фразеалагізму: *(блытаць, змешваць) божы дар з яешняй* ‘(блытаць) розныя, несумяшчальныя рэчы’ (Леп., 1, 319);

5. *дзень суда* × 4; *судны дзень* × 1 (*sądny dzień*), НЗ Мц. 10,15; 11,22; 11,24; 12, 36; 2 Пёт.3,7; 1 Ян. 4,17; зафіксавана *судны час*, ёсць спасылка на *дзень*, якога, на жаль, няма (Акс., Чур., 210); маецца таксама *Суд Божы* (Акс., Чур., 182). У Лепешава можна знайсці толькі *Бог не судзіў* (разм.) ‘не наканавана, не давялося зрабіць што-н.’ (Леп., 1, 101) не звязанае з біблійным тэкстам;

6. *жоран (жарон) млынавы на шыю* (*kamień młyński na szyi*), НЗ Мц. 18,6; Лк. 17,2; Мк. 9,42; у двухтомным слоўніку Лепешава знойдзем толькі прыклад *вісець на шыі (на карку)* з паметай *кніжнае* ‘значная перашкода з якое сутыкаецца хто-н. у якой-н. справе’ (Леп., 1, 482); устойлівае словазлучэнне *камень на шыі* шырока распаўсюджана ў жывой мове, напр. *Бакіеў у Беларусі: козыр ці камень на шыі для афіцыйнага Менску*;[40] *Раніцай ўстаць/ папаўзьці да возера/ камень на шыю/ і ўніз…*;[41] *Карчмару ён загадаў камень на шыю прывязаць, у возеры ўтапіць*[42] *і г.д.;*

7. *зямля абяцаная* (*ziemia obiecana*), НЗ Геб. 11,9; у форме *абяцаная зямля* ‘месца, куды хто-н. моцна імкнецца папасці’ (Леп.,1,458; Акс., Чур., 98);

---

37 І. Багамолава, *Культуры верны слуга*, „Бабруйскае жыццё”, 16.07.2011, http:// www.life.bobr.by/inc_page.php?print=37566, доступ 24.02.2013.

38 Я. Купала, *Цару неба і зямлі*, http://yankakupala.ru/tsaru-neba-i-zyamli, доступ 24.02.2013.

39 М. Я. Супрон (Supron_licvin), *Да пытання аб рэканструкцыі Старога Замку ў Гародні*, Wouk (у каментары), 2012.02.26, http://supron-licvin.livejournal.com/4273.html, доступ 23.02.2013.

40 *Бакіеў у Беларусі: козыр ці камень на шыі для афіцыйнага Менску*, 17.05.2009, Радыё Свабода, http://www.svaboda.org/content/transcript/2044610.html, доступ 23.02.2013.

41 Н. Манцэвіч, *Маляваць усю ноч*, Беларускае літаратурнае радыё, http://litradio. by/350-malyavac-usyu-noch.html, доступ 23.02.2013.

42 *Легенда пра Чырвонае возера*, http://bellib.org/legenda/item/legenda/legenda-051.html, доступ 24.02.2013.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

8. *палец Божы* (*palec Boży*), НЗ Лк. 11,20; у Лепешава зафіксаваны фразеалагізм *божы палец*, але мае ён значэнне ‘гумавая дубінка’ (устар., разм, іран.) (Леп. 2,144);

9. *плач і скрыгатанне зубоў* (*płacz i zgrzytanie zębów*), НЗ Мц. 9,12; 13,24; 13,50; 22,13, 24,51; 25,30; Лк. 13,28; выступае толькі размоўнае *скрыгатаць (заскрыгатаць) зубамі* ‘выяўляць моцную злосць, нянавісць да каго-н. ’ – *zgrzytać (zazgrzytać) zębami* (Леп., 1,101; Акс., Чур., 97);

10. *птушкі нябесныя* × 8; *птушкі* × 2; *нябесныя птушкі* (*niebieski ptak / ptaszek*), НЗ Мц. 6,26; 8,20; 13,4; 13,32; Мк. 4,4; 4,32; Лк. 8,5; 9,58; 13,19; Дзеі 11,12; 11,6; у перакладным польска-беларускім слоўніку зафіксавана толькі *як птушка нябесная (жыць) – tak jak ptaki niebieskie (żyć)* (Акс., Чур., 148);

11. *соль зямлі* (*sól ziemi*), НЗ Мц. 5,13; у значэнні ‘лепшыя прадстаўнікі народа, цвет якога-н. асяроддзя’ фіксуюць і Лепешаў, і Аксамітаў з Чурак (Леп., 2, 367; Акс., Чур., 175);

12. *улонне Абрагама* (*łono Abrahama*), НЗ Лк 16,22; прыведзеныя ў перакладным слоўніку або ў двухтомніку *да Абрама (Абрагама) на піва ісці / пайсці, адпраўляцца (адправіцца) выпраўляцца (выправіцца), ехаць (паехаць), трапіць – przenieść się na łono Abrahama* (Акс., Чур., 21; Леп., 1, 66) маюць экспрэсіўную афарбоўку, параўн. таксама *пайсці за Абрама замуж* (Дан., 149) і інш., з’яўляюцца эўфемічнымі назвамі смерці. А сувязь з біблійным тэкстам апошніх здаецца невялікая[43];

13. *хлеб наш штодзённы* (*chleb powszedni*), НЗ Мц. 6, 11; Лк.11,3; слоўнікамі зафіксаваны фразеалагізм *хлеб надзённы* ‘1. тое, што крайне неабходна для жыцця, для існавання; 2. самае важнае, неабходнае’ (Леп., 2, 526; Акс., Чур., 203).

Дзеяслоўныя фразеалагізмы

Адсутнічаюць у слоўніках:

1. *абтрасці пыл з ног вашых* (*strząsnąć / strzepać proch / pył z sandałów, nóg, stóp*), НЗ Мц. 10,14; Мк. 6,11; Лк. 9,5;

2. *быць добрай надзеі* × 1; *адпачываць* × 1 (*byc dobrej myśli*), НЗ Мк. 10,49; Лк. 12,19;

3. *выбраць найлепшую долю* (*wybrać / obrać lepszą / najlepszą cząstkę*), НЗ, Лк. 10,42;

4. *даць сведчанне* × 5; *сведчыць* × 12; *прымаць сведчанне* × 1; *мы сведкі гэтых падзей* ×1; *яны цяпер сведкі яго* × 1 (*dać / dawać świadectwo*), НЗ Ян. 1,15; 1,32; 1 Ян. 5,6; 5,7; Дзеі 8,25; 13,22; Ян. 1,34; 12, 17; 18, 37; 16,2; 20,24; 23,11; 26,22; Рым.10,2; Гал. 4,15; Геб.10,15;

5. *не ведаць ані дня ані гадзіны* (*nie znać dnia ani godziny*), НЗ Мц. 25,13;

6. *паваліць на зямлю* (*zrównać coś z ziemią)*, НЗ Лк. 19,44.

[43] S. Koziara, *Tradycyjne biblizmy..*, с. 98.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

7. *прайсці (праціснуцца) праз вушка іголкі* (*przejść / przecisnąć się przez uszko igielne*), НЗ Лк. 18, Мт. 19,24; Мк. 10,25;

8. *разадраць шаты свае* × 2; *раздзёрці адзенне* (*rozdzierać / rozrywać szaty*), НЗ Мц. 26,65; Мк. 14,63; Дзеі 14,14;

9. *страсці і устрэсці не толькі зямлю, але і неба* (*poruszyć niebo i ziemię*), НЗ Геб., 12,26.

Зафіксаваныя слоўнікамі:

1. *бачыць сцяблінку ў воку брата, а бервяна ў сваім воку не бачыць* (*widzieć źdźbło w cudzym oku, a w swoim belki nie widzieć*), НЗ Мц. 7,3; Лк. 6,41; ужывае, між іншым, Я. Колас: *Так-та, Амос Адамавіч, – дадае а. Мікалай, – мы бачым сучок у воку брата сваяго, а бервяна ў сваім не заўважаем*.[44] На прыкладзе фразеалагізма можна паказаць наколькі разнастайныя варыянты неаднойчы выступаюць у розных перакладах Бібліі на беларускую мову: *І што ты глядзіш на парушынку ў воку брата твайго, а калоды ў воку сваім не адчуваеш?*[45]; *Чаму ж гэта ты бачыш стрэмку ў воку брата твайго, а палена ў сваім воку ня відзіш?*[46]; *Чаму ты бачыш трэсачку ў воку брата твайго, а палена ў воку сваім ня відзіш?*[47]; *Чаму бачыш шчэпку ў воку брата свайго, а бервяна ў сваім воку не заўважаеш?*[48]; *І што ты ўглядаесся на шчэпку ў воку брата твайго, а палена ў сваім воку не адчуваеш?*[49]; *Што ж ты бачыш парушынку ў воку брата свайго, а калоды ў сваім воку не заўважаеш?* Лук. 6, 41[50]; *І што ты глядзіш на сучок у воку брата твайго, а палена ў сваім воку не адчуваеш?*[51] і г.д.;

2. *біць сябе ў грудзі* (*bić / uderzać w piersi*), НЗ Лк. 18,13; 23,48; – *bić / uderzać się w piersi* (Акс., Чур., 73); *біць кулакамі ў грудзі* ‘вельмі настойліва даводзіць што-н., запэўніваць у чым-н.’ (Леп., 1, 93–94). *Звінець медалямі, біць сябе ў грудзі і патрабаваць…*[52], *І не трэба называць сябе патрыётам, біць у грудзі і даказваць, што гатовы дзеля Радзімы на ўсё*.[53]

---

44 Я. Колас, *На ростанях*, гл.: Я. Іваноў, *Афарыстыка мовы твораў Я. Коласа, Да праблемы лексікаграфічнага апісання*, „Край” 2002, № 3–4, http://kamunikat. fontel.net/ www/knizki/brama/kraj3-4-2002/15.htm, доступ 23.02.2013.

45 Пераклад В. Сёмухі, *Св. Біблія*, http://holybible.by/matthew-by/2132–7.html, доступ 23.02.2013.

46 Пераклад П. Татарыновіча, *Святая Эванэлія паводле Св. Матауша*, http:// chasaslovec.info/index.php?newsid=154&news_page=7, доступ 23.02.2013.

47 Пераклад В. Гадлеўскі, *Святая Эванэлія Езуса Хрыста паводле Матэуша*, http://chasaslovec.info/index.php?newsid=701&news_page=8, доступ 23.02.2013.

48 Пераклад здзейснены Секцыяй па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў Касцёла пры ККББ, http://catholic.by/2/liturgy/lectionary/liturgia-zvyc/ 104014.html)

49 Пераклад М. Міцкевіча, *Евангелле паводле Мацвея й Марка*, http://belmova.hram.by/ index.php?option=com_content&task=view&id=45&Itemid=36, доступ 23.02.2013.

50 Пераклад А. Клышкі, *Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста*, http://knihi. com/none/Pavodle_Macvieja_Sviatoje_Dabraviescie.html, доступ 23.02.2013.

51 Пераклад А. Луцкевіча, Л. Дзекуць-Малея, *Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста і Псальмы*, http://www.christjes.us/Bibles/DZML/MAT/7, доступ 23.02.2013.

52 А. Пушкін, *«Аўганец» Вячаслаў Белавус: Больш за палову маіх аднапалчанаў ужо памерлі*, Радыё Свабода, 15.02.2013, http://www.svaboda.org/content/article/ 24903389. html. доступ 24.02.2013.

53 В. Зубар, К. Мухін, *Грамадзянін Радзімы*, „Петрыкаўскія навіны”, 15.02.2013, http://www.petrikov.by/2013/02/gramadzyanin-radzimy/, доступ 24.02.2013.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

3. *горка заплакаць* × 2 (*gorzko płakać*); НЗ Мц. 26,75; Лк. 22,62; формула вядомая з народных казак і легендаў, хоць у слоўніках адсутнічае;

4. *не кідаць перлаў вашых перад свіннямі* ((*nie*) *rzucać perły przed / między wieprze / świnie*), НЗ Мц. 25,13; размоўнае *сыпаць бісер (перлы) перад свіннямі*, ‘дарэмна гаварыць пра што-н. ці даказваць што-н. таму, хто не здольны або не хоча зразумецьгэта’ (Леп., 2, 413; Акс., Чур., 29, 141);

5. *не мець дзе галаву прытуліць* (*nie mieć, gdzie głowy skłonić*), НЗ Мц. 8,20; Лк. 9,58); *прытуліць (прыхіліць, прыхінуць) галаву* (разм.) ‘знайсці прыстанішча, жыць (знаходзіцца) дзе-н. ці ў каго-н.‘ (Леп., 2, 223–224; Акс., Чур., 63);

6. *памыць рукі* (*umyć / umywać ręce*), НЗ Мц. 27,24; *умываць / умыць рукі* ‘адмаўляцца ад удзелу ў чым-н., ухіляцца ад адказнасці’ (Акс., Чур., 159; Леп., 2, 491);

7. *пасць да ног яго* (*paść / upaść do nóg / stóp*), НЗ, Мк 5,22; Лк. 8,41; Дзеі 10,25; Аксамітаў і Чурак фіксуюць *падаць, упасці ў ногі* Акс., Чур. 131);

8. *прайсці (праціснуцца) праз вушка іголкі* (*przejść / przecisnąć się przez uszko igielne*), НЗ Лк. 18,25; Мк. 10,25; слоўнікі не фіксуюць, але ўжываецца ў публіцыстыцы, наукова-папулярных публікацыях, інтэрнэце, напр.: *Відаць паспрабуе ўлада прайсці ў вушка іголкі, пабачым ці выйдзе!*[54], *Аднак лягчэй вярблюду пралезці праз вушка іголкі, чым знайсці такога спонсара*[55], *Як гаворыцца, мала пралезці ў вушка іголкі, трэба яшчэ даказаць, што ты не вярблюд*[56];

9. *сканаць* × 3; *аддаць духа* (*wyzionąć ducha*), НЗ Мц. 27,50; Мк. 15,37; Лк. 23,46; Ян. 19,30; *аддаваць / аддаць Богу душу – oddać Bogu duszę* (Акс., Чур., 32; Леп.,1,54), іншае, з экспрэсіўнай афарбоўкай *дух (душа) вон* (Акс., Чур., 85);

10. *упірацца проці ражна* (*wierzgać przeciw ościeniowi*), НЗ Дзеі 26,14; *перці супраць ражна – iść pod prąd* (Акс., Чур., 151), *перці / перціся на ражон*, *перці (супроць / проці) ражна, лезці на ражон* (праст.) ‘рабіць што-н. Рызыкоўнае, асуджанае на няўдачу, дзейнічаць, не думаючы пра вынікі’ (Леп., 1,182–183);

11. *я ціхі ды пакорлівы сэрцам* [*(być) cichy(m) i pokornego serca*], НЗ Мц. 11,29; галоўным чынам ужываецца спалучэнне *ціхі і пакорны*, *ціха і пакорна*, напр. *Беларус заўсёды пакорны і ціхі, як вада*,[57] але таксама *ціхая пакора ў сэрцы*,[58] *у голасе*.[59]

---

[54] Ю. Дракахруст, *Загадка судзейскай хваробы*, каментар Шварца, Радыё Свабода, 20.05.2011, http://nn.by/index.php?c=ar&i=54655&p=1&c2=calmonprev&lang=be&combo_calmonth=4&combo_calyear=2009, доступ 24.02.2013.

[55] А. Паплаўская, *„Літаратура і мастацтва". Эканамічнае сутарэнне*, Блог, 16.08.2009, http://paplauskaja.net/litaratura-i-mastactva-ehkanamichnaye-sutarennye/, доступ 24.02.2013.

[56] В. Хвоін, *Майстэрства дэкарацый*, „Новы час", 26.09.2008, http://novychas. org/arch/2008/32/majsterstva.php, доступ 24.02.2013.

[57] Палачанін, *Што кажуць аб нас палякі?*, 06.01.2011, http://arche.by/by/page/print/ 4222, доступ 24.02.2013

[58] Л. Геніюш, *У песнях ёсць хлеб,* http://zmila.at.tut.by/by/Hienijusz.html, доступ 23.02.2013.

[59] М. Зарэцкі, *Бацькаў сын,* http://old.knihi.com/zarecki/syn.html, доступ 23.02.2013.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

4. Заканчэнне

Некаторыя заўвагі па выніках аналізу беларускіх эквівалентаў польскіх фразеалагізмаў біблійнага паходжання:

1. тэма біблеізмаў папулярная ў польскім мовазнаўстве, даволі добра даследаваная на матэрыяле іншых славянскіх моў, у беларускім мовазнаўстве займае перыферыйную пазіцыю, асабліва ў адносінах да сучасных перакладаў *Біблii*. Прычыны, як здаецца, трэба шукаць у адносінах да Бога і рэлігіі ў беларускім грамадстве і дзяржаве;

2. у польскую мову большасць устойлівых словазлучэнняў трапіла з перакладу Бібліі Я. Вуйка, яны маюць доўгую традыцыю; беларускія пераклады не знайшлі такога эклезіястычнага, сацыяльнага і культуратворчага поспеху,[60] сёння, патрэбна ўтварыць новыя эквіваленты або іх запазычыць з іншых моў, стварыць калькі (паўкалькі);

3. толькі частка фразеалагічных адзінак, прычым даволі малая, цалкам агульная для абедзвюх моў: беларускай і польскай. Эквіваленцыя фразеалагічных адзінак мала калі бывае поўная. Колькасць біблеізмаў у розных мовах розная, як розныя шляхі развіцця моў, так і ўплывы біблійных тэкстаў на мову розныя;[61]

4. пераклады Бібліі на польскую мову мелі значны ўплыў на яе развіццё, прынамсі, на фразеалагічны склад. Пытанне: ці пераклады Святога Пісання на беларускую мову ўздзейнічалі на яе лёс у такой жа ступені і былі непасрэднай крыніцай біблійных фразеалагізмаў, застаецца адкрытым. Здаецца, што сітуацыя магла быць неаднойчы адваротнай, менавіта, шматлікія калькі з царкоўнаславянскай ці з польскай моў выкарыстоўваюцца ў новых перакладах *Біблii* на беларускую мову.[62] Адзіны пераклад на дыялектную мову – палескую гаворку – абмежаваны ў карыстанні і не ўплывае на агульную беларускую мову ніякім чынам;

5. у беларускім перакладзе некаторыя ўстойлівыя словазлучэнні заменены залежнымі сказамі (напр. *Свет, які стварыў Бог*, побач са *стварэнне (тварэнне) Божае – stworzenie Boże*; *Сілы, што на небе*, побач з *сілы нябесныя – tosce niebiańskie*) або асобнымі лексемамі (напр. *Кніжнікі /першасвятары і кніжнікі – uczony w piśmie; птушкі /нябесныя птушкі /птушкі нябесныя – niebieski ptak /*

[60] Я. Казлоўская-Дода, Асаблівасці *мовы так званага «экуменічнага перакладу» Новага Запавету* (*2003 г.*). *Лінгвістычныя нататкі*, [у:] *Другі Міжнародны кангрэс даследчыкаў Беларусі. Працоўныя матэрыялы*, т. 2, Каунас 2013, с. 344.

[61] R. Sendek, *Biblizmy języka macedońskiego w konfrontacji z frazeologizmami polskimi, bułgarskimi i serbsko-chorwackimi*, [w:] R. Sendek, *Studia z frazeologii bułgarskiej i macedońskiej*, Kraków 2007, c. 144, 147; параўн. Таксама: Г. Гак, *Специфика библейских фразеологизмов в русском языке*, [w:] *Problemy frazeologii europejskiej II*, Warszawa 1997, c. 95–104.

[62] Так адбываецца таксама ў македонскай мове: R. Sendek, *Biblizmy języka macedońskiego…*, c. 156–157.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

ptaszek; вяселле /час шлюбу /вячэра шлюбная – uczta weselna) і не могуць мець устойлівага характару;

6. на замацаванне пазіцыі пэўных словазлучэнняў і фрагментаў Бібліі ў польскай мове зрабіў значны уплыў пантыфіката Яна Паўлы II (напр. *Nie lękajcie się! – Не бойцеся!, Wypłyń na głębię – Паплыві на глыбіню, Aby wszyscy byli jedno – Каб яны былі адно, Ducha nie gaście – Духа не гасіце, Zło dobrem zwyciężaj – Перамагай зло дабром, Jeden drugiego brzemiona noście – Насіце цяжары адзін аднаго*) і г.д.;

7. шматлікія фразеалагізмы маюць варыянты і розныя формы, добра гэта бачна на прыкладзе *Бачыць сцяблінку ў воку брата, а бервяна ў сваім воку не бачыць,* сітуацыя натуральная, паколькі беларуская біблійная фразеалогія знаходзіцца на этапе фарміравання, той жа або прыблізны сэнс выражаецца рознымі формамі таго ж самага фразеалагізма.[63] Дарэчы, факт характэрны і для польскай біблійнай фразеалогіі, з той розніцай, што там функцыянуюць устабілізаваныя формы побач з аказіянальнымі варыянтамі.

8. асобным пытаннем з'яўляцца: ці біблеізмы жывыя ў мове звычайных беларусаў, якія з іх пасіўнымя і маюць характар выключна кніжны, як змяняецца іх значэнне ў сучаснай камунікацыі?

Умоўныя скарачэнні:

НЗ – Новы Запавет
Мц. – Евангелле паводле Мацвея
Мк. – Евангелле паводле Марка
Лк. – Евангелле паводле Лукі
Ян. – Евангелле паводле Яна
Деі – Дзеі Святых Апосталаў
Рым. – Ліст да Рымлянаў
1 Кар. – Першы ліст да Карынцянаў
2 Кар. – Другі ліст да Карынцянаў
Гал. – Ліст да Галатаў
Эф. – Ліст да Эфесцаў
Плп. – Ліст да Піліпінцаў
Клс. – Ліст да Калосцаў
1 Тэс. – Першы ліст да Тэсалонцаў
2 Тэс. – Другі ліст да Тэсалонцаў
1 Цім. – Першы ліст да Цімафея
2 Цім. – Другі ліст да Цімафея
Ціт. – Ліст да Ціта
Флм. – Ліст да Філімона
Геб. – Ліст да Гебраяў

[63] Таксама параўн.: R. Sendek, *Biblizmy języka macedońskiego..*, с. 156.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 17/01/2026 14:55:11

Як. – Ліст Якуба
1 Пёт. – Першы ліст Пётры
2 Пёт. – Другі ліст Пётры
1 Ян. – Першы ліст Яна
2 Ян. – Другі ліст Яна
3 Ян. – Трэці ліст Яна
Юд. – Ліст Юды
Адк. – Адкрыццё Святога Апостала Яна Багаслова

Леп. – І. Лепешаў, *Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы.* У 2 т., Мінск 1993.
Акс., Чур. – А. Аксамітаў, М. Чурак, *Польска-беларускі фразеалагічны слоўнік*, Варшава 2000.
Дан. – М. А. Даніловіч, *Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны*, Гродна 2000.

Summary

In the functional and stylistic differentiation of modern Belarusian language the researchers assign a bigger position to religious texts. Church and religious literature is internally dissimilar, the translations of the Bible make up its core. Books of the Holly Scripture have been source of numerous collocations and expressions and proverbs in different languages. Despite the growing interesting the problem, the idioms of biblical origin in the Belarusian language have not been studied enough.

The Belarusian equivalents of biblical words inherited in the Polish language have been analyzed in the article on the material of the New Testament translated by U. Charniausky under the editorship of J. Nekrashevich-Karotkaya.